иностранного языка. Привыкание к правилам грамотного использования языка, применение эффективных методов, регулярность занятий и настойчивость в достижении желаемого результата всегда приводит к успеху в обучении английскому языку.

**Список использованных источников:**


1. Кечкина, Е. Э. Нетрадиционные методы преподавания английского языка / Е. Э. Кечкина // Иностранные языки в контексте межкультурной коммуникации. Материалы докладов XIII Всероссийской науч.-практ. конф. с международным участием. – 2021. – С. 252–256.
2. Драчук, И. В. Использование ролевых игр по спортивной тематике на уроках английского языка в старших классах / И. В. Драчук, А. Е. Новикова // Современные методы и технологии преподавания иностранных языков. – 2019. – С. 198–202.
3.Лукина, М. В. Деятельность учителя и учащихся на уроке английского языка с личностно-ориентированной направленностью / М. В. Лукина // Инновационные технологии обучения иностранному языку в вузе и школе: реализация современных ФГОС : сборник научных трудов по материалам Четвертой Междун. науч.-практ. конф. – 2019. – С. 93–97.
4. Рукосуева, О. Ю. Определение сущности и содержания проектной компетенции изучающих иностранный язык / О. Ю. Рукосуева // Инновационные технологии обучения иностранному языку в вузе и школе: реализация современных ФГОС : сборник научных трудов по материалам Четвертой Междун. науч.-практ. конф. – 2019 – С. 130–134.
5. Иванова, С. В. Методика работы с лингвострановедческим материалом в средних классах / С. В. Иванова, В. А. Алексеева // Современные методы и технологии преподавания иностранных языков. – 2019. – С. 213–217.
6. Жантуганова, А. С. Современные методы преподавания английского языка / А. С. Жантуганова // Наука и образование сегодня. – 2021. – С. 50–51.
7. Фирсова, А. В. Проблемы в изучении английского языка и способы их решения / А. В. Фирсова // Международный журнал гуманитарных и естественных наук. – 2022. – С. 25–28.


# ВЫКАРЫСТАННЕ ПРАБЛЕМНЫХ СІТУАЦЫЙ НА ЎРОКАХ ПА ВУЧЭБНАМУ ПРАДМЕТУ «ЧАЛАВЕК І СВЕТ» З МЭТАЙ ПАВЫШЭННЯ ЦІКАВАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ДА ПРАДМЕТА


*Новікава Н. А.,*
*ДУА «Сярэдняя школа № 39 г.Магілёва»,*
*г. Магілеў, Рэспубліка Беларусь*



**Анатацыя.** Выкарыстанне праблемных сітуацый на ўроках курса “Чалавек і свет” дазваляе малодшым школьнікам атрымаць задавальненне ад працы з кожнай новай тэмай, дазваляе павысіць цікавасць да вывучэння дадзенага прадмета.

**Resume.** The use of problematic situations in the lessons of the course "Man and the World" allows younger students to enjoy working with each new topic, can increase interest in learning the subject.



**Ключавыя словы:** праблемныя сітуацыі, фарміраванне ведаў, уменняў, навыкаў.

**Key words:** problem situations, formation of knowledge, skills, abilities.


Мэтай сучаснай адукацыі з'яўляецца фарміраванне ведаў, уменняў, навыкаў і інтэлектуальнае, маральнае, творчае і фізічнае развіццё асобы навучэнца [1]. Я лічу, што

для дасягнення гэтай мэты настаўнік павінен дапамагаць навучэнцам самім адкрываць новыя веды, улічваючы ўзроставыя і псіхалагічныя асаблівасці малодшых школьнікаў. Актуальнасць дадзенай тэмы абумоўлена фарміраваннем умення самастойна здабываць веды, збіраць неабходную інфармацыю, аналізаваць і рабіць высновы.

Праблемная сітуацыя – сітуацыя, у якой навучэнцы, ужываючы практычныя або тэарэтычныя веды, сутыкаюцца з сітуацыяй выбару, хочуць вырашыць пастаўленыя задачы, але з-за недахопу дадзеных, вымушаны самі іх шукаць, развіваючы такім чынам актыўную пазнавальную дзейнасць [2].

Асноўная функцыя вучэбнага прадмета «Чалавек і свет» – навучыць дзіця здабываць веды, неабходныя для каштоўнасна-арыентаванага і дзейснага стаўлення да навакольнага прыроднага і сацыяльнага асяроддзя, стварыць умовы фарміравання гэтых адносін. Галоўнай умовай рэалізацыі названай функцыі з'яўляецца стварэнне адпаведнага адукацыйнага асяроддзя. Для стварэння такога асяроддзя я вырашыла прымяняць праблемныя сітуацыі.

На маю думку, уключэнне навучэнцаў у вырашэнне праблемных сітуацый на ўроках курса «Чалавек і свет» – асноўны шлях павышэння цікавасці да гэтага прадмета. Гэтаму спрыяе магчымасць выказаць сваё меркаванне, даказаць свой пункт гледжання, развіццё ўмення самастойна здабываць веды.

Магчымасць паказаць дзіцяці розныя шляхі вырашэння праблемных сітуацый – я лічу сваёй галоўнай задачай на ўроку. Навучэнцы атрымліваюць магчымасць параўноўваць, назіраць, рабіць вывады, вучыцца вырашаць праблемныя сітуацыі.

Праблемныя сітуацыі на сваіх уроках я выкарыстоўваю з першага класа. Працу будую па наступным прынцыпе: ад простага да складанага. У пачатку навучання ў першым класе я прапаную простыя, на першы погляд, пытанні: Чаму….? Якая прычына…? Што змянілася, калі б …? Чым адрозніваюцца (што агульнага) …? Якую выснову мы можам зрабіць …? Што здарыцца, калі…? Пытанні такога тыпу задаю перад працай над тэмай. (На дошцы дзве групы карцінак. 1 група: дрэва, людзі, кветкі. 2 група: сонца, неба, пясок. Па якой прыкмеце я падзяліла гэтыя прадметы?).

Як паказвае практыка, вельмі маленькі працэнт навучэнцаў гатовы адразу адказваць на пытанні. Я лічу, што праблема не ў тым, што ў навучэнцаў няма дастатковага ўзроўня ведаў. Многія навучэнцы баяцца выказаць сваё меркаванне, нават, калі яно правільнае, а многія проста не жадаюць працаваць.

Па меры ўзнікнення дыялогу пры выкарыстанні такіх пытанняў больш замкнёныя дзеці пачынаюць паднімаць руку і выказваць свае меркаванні. Ужо на гэтым этапе хлопцы сутыкаюцца з тым, што выказваюць кожны сваё меркаванне, якое адрозніваецца ад іншых.

Толькі пасля гэтага можна пераходзіць на наступны этап вырашэння праблемных сітуацый. Далей на ўроках курса «Чалавек і свет» пры паўтарэнні вывучанага матэрыялу спецыяльна дапускаю невялікія памылкі ці недакладнасці. Некаторыя навучэнцы, звычайна іх мала, 2-3 чалавекі, паднімаюць рукі і выпраўляюць памылкі. Паступова такіх вучняў станавіцца ўсё больш.

Калі навучэнцы становяцца больш уважлівымі, дапускаю памылкі і пры тлумачэнні новага матэрыялу. Бачачы разыходжанні ў тым, што я расказваю, з іх жыццёвым вопытам, навучэнцы смялей задаюць пытанні, адказ на якія мы шукаем разам (абмеркаванне, чытанне артыкула падручніка, выкананне заданняў у рабочым сшытку). Першы год сістэматычнага выкарыстання праблемных пытанняў дае магчымасць пашырыць экалагічныя прадстаўленні дзяцей, падрыхтаваць вучняў да далейшага ўспрымання навучальнага матэрыялу з цікавасцю.

З другога класа пачынаю задаваць больш складаныя праблемныя пытанні, адказы на якія патрабуюць веды, атрыманыя не на ўроках. Часта выкарыстоўваю франтальную гутарку, падчас якой могуць сутыкнуцца адразу больш за дзве думкі. Мая задача – дапамагчы разабрацца, прыйсці да адзінага меркавання, не даючы гатовага адказу, а толькі накіроўваючы.

Пры знаёмстве з тэмай «Значэнне хатніх і дзікіх жывёл у жыцці чалавека», абмяркоўваем такія пытанні:

– Пчала – гэта хатняя жывёла ці не?

– А трус?

Давайце паспрабуем разабрацца. Пчала жыве на пчальніку, а трус?

– А чаму хатніх жывёл так называюць? (Жывуць побач з чалавекам і чалавек пра іх клапаціцца).

– А ці трэба нам клапаціцца аб трусах ці яны самі пра сябе клапоцяцца?

Такія гутаркі ставяць маіх вучняў у актыўную пазіцыю, абуджаюць цікавасць да вывучэння прадмета "Чалавек і свет", вучаць умець чуць адзін аднаго і выказваць свае меркаванні. На сваіх уроках я імкнуся стварыць такія ўмовы, каб кожнае дзіця магло выказаць уласнае меркаванне, жыццёвыя назіранні і веды, атрыманыя не на ўроках.

З трэцяга класа ў працу дзяцей я дадаю вялікую самастойнасць пры рашэнні праблемных сітуацый. Акрамя пытанняў, меркаванняў, гутарак, дыялогаў, выкарыстоўваю працу ў групах. Склад гуртоў магу мяняць. Працуючы ў групах, навучэнцы вучацца выслухоўваць адзін аднаго і прымаць адзінае рашэнне, нават калі яно з'яўляецца памылковым. Пры праверцы выкананых заданняў даволі часта назіраюцца разыходжанні ў меркаваннях. У такіх сітуацыях я прыходжу на дапамогу сваім вучням і надалей мы разбіраемся разам. Напрыклад, для працы ў групах ці парах пры вывучэнні тэмы “Жабы і рапухі” прапаную адгадаць, ад каго прыйшла тэлеграма і вызначыць тэму ўрока.

Вядома, усе навучэнцы хутка адгадваюць, хто даслаў тэлеграму. Аднак мала хто з хлопцаў устае на іх абарону. Пасля доўгіх абмеркаванняў, мы прыйшлі да высновы, што і жабы, і рапухі вельмі патрэбны і прыносяць вялікую карысць.

Таксама з трэцяга года навучання, з другога паўгоддзя, навучэнцам прапануецца знайсці адказы на некаторыя пытанні дома з дапамогай інтэрнэту або з дапамогай энцыклапедыі. Гэта тыя пытанні, якія ўзнікаюць падчас урока, але на дадзеным уроку мы іх абмеркаваць не можам. Напрыклад, чаму чаротная жаба занесена ў Чырвоную кнігу?

Як паказвае практыка, навучэнцы даволі хутка засвойваюць самастойную працу з дадатковай літаратурай і ахвотна яе выконваюць. Такім чынам, навучэнцы рыхтуюцца праводзіць міні - даследаванні. Ужываючы такую форму працы, лічу неабходным абавязкова выслухаць адказы навучэнцаў на наступным уроку.

У чацвёртым класе павысіць цікавасць да вывучэння курса «Чалавек і свет» для мяне стала асабліва важна. Асабліва з-за таго, што ў вучняў узнікае яшчэ адна цяжкасць: вывучанне прадмета ідзе на беларускай мове. Я лічу, што гэта вельмі важны прадмет, бо ён знаёміць дзяцей з гісторыяй нашай краіны і рыхтуе да вывучання гісторыі надалей. У рашэнні дадзенай праблемы мне вельмі дапамаглі праблемныя пытанні, міні-даследаванні, праблемныя гутаркі, якія закліканы былі зацікавіць навучэнцаў да вывучэння дадзенага прадмета.

Урок па тэме «Маўклівыя сведкі мінуўшчыны» я пачала з легенды. Высветліла, што некаторыя навучэнцы таксама ведаюць легенды. І тут паўстае пытанне, ці могуць камяні расказаць нам што-небудзь.

Па тэме «Князёўна з трыма імёнамі» прапаную дзецям правесці міні-даследаванне і высветліць, як так атрымалася, што ў аднаго чалавека тры розныя імёны. Па тэме «Еўфрасення Полацкая» навучэнцы праводзяць працу ў групах па складанні радаводу. Як паказала практыка, навучэнцы робяць гэта з вялікай цікавасцю, нават калі ў іх не ўсё атрымліваецца.

Акрамя пытанняў, якія я задаю пры вывучэнні тэмы, навучэнцы таксама маюць права задаваць свае пытанні. Я лічу, што калі вучань задае пытанне і атрымлівае на яго адказ ці падказку, гэта таксама павялічвае цікавасць да вывучэння дадзенага прадмета.

У сваёй практыцы я часта выкарыстоўваю такі метадычны прыём стварэння праблемнай сітуацыі, як «Яскравая пляма». Гэты прыём можна выкарыстоўваць у любым класе, з першага па чацвёрты. Прыём «Яскравая пляма» заключаецца ў паведамленні тэмы

ўрока праз цікавы для дзяцей матэрыял. Гэта можа быць казка, прытча, легенда, рэбус, жарт, выпадак з жыцця і г.д. Такі пачатак урока прыцягвае навучэнцаў і падводзіць да тэмы ўрока, якую яны ж самі і фармулююць.

Выкарыстанне праблемных сітуацый на ўроках курса «Чалавек і свет» дазваляе малодшым школьнікам атрымаць задавальненне ад працы з кожнай новай тэмай, дазваляе павысіць цікавасць да вывучэння дадзенага прадмета. Такую выснову магу зрабіць, абапіраючыся на асабістыя назіранні і вынікі паўторнага анкетавання.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Концепция учебного предмета «Человек и мир» на I ступени общего среднего образования (для общеобразовательных учреждений с русским языком и белорусским языком обучения) [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://adu.by /. – Дата доступа: 10.11.2018.

2. Учебная программа для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения для 1 класса [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by /.– Дата доступа: 10.11.2021.

## ИССЛЕДОВАНИЕ СОБСТВЕННОГО ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО БУДУЩЕГО В ПРОЦЕССЕ ОСВОЕНИЯ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ ПРОГРАММЫ

*Панфилов А.Н., Панфилова В.М.,*
*Казанский федеральный университет,*
*г. Елабуга, Республика Татарстан, Российская Федерация*

**Аннотация.** Статья посвящена поиску дидактического решения формирования компетенций обучающихся, осваивающих образовательную программу высшего педагогического образования по исследованию собственного профессионального будущего. Представлен вариант по применению персонального форсайта будущими педагогами в процессе обучения.

**Resume.** The article is devoted to the search for a didactic solution for the formation of the competencies of students mastering the educational program of higher pedagogical education to study their own professional future. A variant on the use of personal foresight by future teachers in the learning process is presented.

**Ключевые слова:** образовательная программа, профессиональное будущее, персональный форсайт.

**Key words:** educational program, professional future, personal foresight.

Современный рынок образования требует от педагогов постоянного обновления компетенций. По этой причине обучающимся, осваивающим основную профессиональную образовательную программу (ОПОП) высшего педагогического образования, трудно предвидеть профессионально-личностное будущее, опираясь на полученный опыт школьного образования. Целенаправленное планирование и формирование профессиональной траектории на разных временных горизонтах в сочетании со способностью адаптироваться к меняющимся технологическим и экономическим контекстам выступают базовым фактором выстраивания успешной профессиональной карьеры и некоторой гарантией востребованности на рынке квалифицированного труда. Прогноз будущей профессиональной карьеры неизбежно приводит обучающегося к действиям управления своим обучением и к действиям приобретения профессионально-личностного опыта.